**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Калектарная, 10, 220004, г. Мінск
Тэл./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Коллекторная, 10, 220004, г. Минск
Тел./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

12.02.2010 № 06-14/89

На № ______________________

Мацкевічу С.Д. і інш.

Аб адмове ў рэгістрацыі
АКГА "Асамблея НДА"

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь разгледзела дакументы аб рэгістрацыі Асацыяцыі каардынацыі грамадскіх аб'яднанняў "Асамблея няўрадавых дэмакратычных аб'яднанняў" (далей - АКГА "Асамблея НДА") і паведамляе наступнае.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" (далей - Закон) грамадскія аб'яднанні маюць права ствараць саюзы (асацыяцыі). Згодна артыкула 1 Закона саюзы (асацыяцыі) ствараюцца для каардынацыі статутнай дзейнасці, прадстаўлення і абароны агульных законных інтарэсаў грамадскіх аб'яднанняў, якія ўваходзяць у саюз (асацыяцыю). Пры гэтым статутная дзейнасць і рэалізацыя законных інтарэсаў грамадскіх аб'яднанняў ажыццяўляюцца шляхам рэалізацыі мэтаў, задач і метадаў дзейнасці, замацаваных у статуце гэтых аб'яднанняў.

Згодна артыкулу 45 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь юрыдычная асоба можа мець грамадзянскія правы, якія адпавядаюць мэтам дзейнасці, прадугледжаным у яе устаноўчых дакументах, а таксама прадмету дзейнасці і несці звязаныя з гэтай дзейнасцю абавязкі. Як відавочна, юрыдычная асоба можа ажыццяўляць не любую дзейнасць, а толькі вызначаную ў яе устаноўчых дакументах (прадмет дзейнасці) і якая накіравана на дасягненне пастаўленай мэты.

Такім чынам, абавязковай умовай стварэння саюза (асацыяцыі) грамадскіх аб'яднанняў з'яўляецца агульнасць статутных мэтаў і задач аб'яднанняў, якія ўваходзяць у дадзены саюз (асацыяцыю), што таксама павінна адлюстроўвацца ў мэтах і прадмеце дзейнасці саюза (асацыяцыі).

Аднак прадстаўленыя дакументы сведчаць, што пры стварэнні АКГА "Асамблея НДА" умовы аб агульнасці статутных мэтаў, задач і

прадмета дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў, якія ўваходзяць у склад АКГА "Асамблея НДА", не выкананы.

Так, мэтай дзейнасці Грамадскага аб'яднання шматдзетных сямей Верхнядзвінскага раёна "Сям Я" з'яўляецца аб'яднанне бацькоў Верхнядзвінскага раёна, якія маюць на ўтрыманні трох і больш дзяцей, для рэалізацыі і абароны грамадзянскіх, сацыяльных, культурных і іншых правоў і інтарэсаў; прадметам дзейнасці - грамадская работа, накіраваная на аказанне дапамогі шматдзетным сем'ям. Мэта дзейнасці Віцебскага грамадскага аб'яднання "Самакіраванне і грамадства" - садзейнічанне працэсам усталявання на тэрыторыі Віцебскай вобласці дэмакратычных рэформаў, праводзімых у Рэспубліцы Беларусь; прадмет дзейнасці - асветніцкая праца ў вобласці самакіравання і грамадзянскай супольнасці. Грамадскае аб'яднанне "Цэнтр па правах чалавека" ставіць сваёй мэтай абарону правоў чалавека, гарантаваных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека і іншымі міжнароднымі пактамі, дамовамі, пагадненнямі, ратыфікаванымі Рэспублікай Беларусь, а прадметам дзейнасці - асветніцкую і інфармацыйную дзейнасць у галіне папулярызацыі і прапаганды правоў і свабод чалавека, выкладзеных у названых дакументах.

Мэтавы прынцып стварэння асацыяцый вызначаецца і ва ўстаноўчых дакументах некаторых заснавальнікаў АКГА "Асамблея НДА". Так, статутам Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Беларускі Хельсінкскі Камітэт" ( п. 1.10), вызначана, што РПГА "БХК" можа ўваходзіць і ствараць міжнародныя і іншыя саюзы (асацыяцыі) грамадскіх арганізацый, дзейнасць якіх адпавядае статутным мэтам і задачам РПГА "БХК". Зыходзячы з мэтаў і задач РПГА "БХК" (якія не адпавядаюць мэтам і задачам АКГА "Асамблея НДА") яго ўдзел у стварэнні АКГА "Асамблея НДА" з'яўляецца неправамерным.

Вызначанае сведчыць аб парушэнні парадку стварэння саюза (асацыяцыі) грамадскіх аб'яднанняў.

У адпаведнасці з артыкулам 9 Закона статут асацыяцыі павінен утрымліваць мэты, задачы, прадмет і метады дзейнасці.

Аднак прадмет дзейнасці, выкладзены ў статуце АКГА "Асамблея НДА", не раскрывае сутнасці дзейнасці АКГА "Асамблея НДА", ён паўтарае палажэнні мэты дзейнасці, але не вызначае праз якую дзейнасць гэта мэта дасягаецца. Такім чынам, прадмет дзейнасці АКГА "Асамблея НДА" не вызначаны.

Акрамя таго, змест мэты паўтараецца ў задачах і метадах дзейнасці АКГА "Асамблея НДА" і не раскрывае таго, што патрабуе вырашэння

(задачы) і якімі спосабамі, прыемамі (метады). А такі азначаны метад, як маніторынг, аналіз і ацэнка дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў, наогул не адпавядае вызначанай мэце АКГА "Асамблея НДА".

Назва АКГА "Асамблея НДА" таксама не ўтрымлівае ўказання на прадмет дзейнасці яе членаў, як таго патрабуе норма артыкула 12 Закона.

Не адпавядае патрабаванням заканадаўства і устаноўчая дамова аб стварэнні АКГА "Асамблея НДА". У прыватнасці, не вызначаны месца знаходжання АКГА "Асамблея НДА", мэта дзейнасці, як таго патрабуе артыкул 48 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Палажэнне ўстаноўчай дамовы аб выбарах кантрольна-рэвізійнага органа АКГА "Асамблея НДА" не адпавядае патрабаванням артыкула 10 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" (рэвізор павінен абірацца вышэйшым органам, а не кіруючым).

Акрамя таго, устаноўчай дамовай аб стварэнні АКГА "Асамблея НДА" і яе статутам прадугледжаны ўступныя і членскія ўнёскі. Згодна атрыкулу 21 Закона грашовыя сродкі і іншая маёмасць грамадскіх аб'яднанняў могуць выкарыстоўвацца толькі для выканання іх статутных мэтаў і задач. Мэты і задачы АКГА "Асамблея НДА" і мэты і задачы аб'яднанняў-заснавальнікаў не дапасуюцца паміж сабой, у сувязі з чым накіраванне сваіх сродкаў на стварэнне і дзейнасць АКГА "Асамблея НДА" супярэчыць статутам дадзеных аб'яднанняў. Гэта яшчэ раз пацвярджае мэтавы прынцып стварэння асацыяцый.

Такім чынам, пры стварэнні АКГА "Асамблея НДА" парушаны парадак яе стварэння; не вызначаны прадмет дзейнасці; азначаныя мэта, задачы, метады дзейнасці не дапасуюцца паміж сабой; назва асацыяцыі і устаноўчая дамова не адпавядаюць патрабаванням заканадаўства; парадак фарміравання маёмасці асацыяцыі супярэчыць статутам арганізацый-заснавальнікаў АКГА "Асамблея НДА".

На падставе выкладзенага, у адпаведнасці з артыкулам 15 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь прынята рашэнне аб адмове ў рэгістрацыі АКГА "Асамблея НДА".

Намеснік Міністра А.А.Сіманаў

Паплаўская 200 61 95
12.02.2010 дак 14